лишенная всякой игры любовь выводит Роберта и Пат из состояния душевного оцепенения. Им приходится противостоять не только смертельному заболеванию, но и суете и безысходности окружающего мира. Поддержка друзей, их благородство помогают влюбленным в самых сложных ситуациях.

Дружба трех молодых людей — это не иллюзия, это тот мир, где реально все: преданность, верность и любовь. Когда они вместе, внешние обстоятельства не способны разрушить их стремление к жизни. Несмотря на трагическую развязку романа автор дает надежду, что такая искренняя любовь и такая удивительная дружба могут встретиться и нам. Это идеал, к которому хочется стремиться.

**Заключение.** Эрих Мария Ремарк — писатель «потерянного поколения». Это группа «рассерженных молодых людей», прошедших ужасы Первой мировой войны (и увидевших послевоенный мир вовсе не таким, каким он виделся из окопов) и написавших свои первые книги, шокирующие западную публику. К таким писателям, наряду с Э. М. Ремарком, относились Ричард Олдингтон, Джон Дос Пассос, Эрнест Хемингуэй, Френсис Скотт Фицджеральд.

**Список цитируемых источников**


1. *Ремарк, Э. М.* Жизнь взаймы / Э. М. Ремарк. — М. : ВИТА-ЦЕНТР, 1992. — 191 с.
2. *Ремарк, Э. М.* Приют грез / Э. М. Ремарк. — М. : ВИТА-ЦЕНТР, 1992. — 398 с.
3. *Ремарк, Э. М.* Три товарища / Э. М. Ремарк. — М. : ВИТА-ЦЕНТР, 1992. — 416 с.
4. *Ремарк, Э. М.* Черный обелиск / Э. М. Ремарк. — М. : ВИТА-ЦЕНТР, 1992. — 383 с.



УДК 373.2



**Д. С. Доўнар**

*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*


# МЕТАДЫЧНАЯ СПАДЧЫНА ЯКУБА КОЛАСА

**Уводзіны.** Дыдактычныя погляды Коласа фарміруюцца ў першую чаргу пад уплывам ідэй айчыннай педагогікі другой паловы XIX стагоддзя і адлюстроўваюць іх сутнасць. Прагрэсіўная педагагічная тэорыя была састаўной часткай у станаўленні грамадска-палітычных і філасофскіх поглядаў Я. Коласа як педагога, а потым і як пісьменніка.

**Асноўная частка.** Аснову дарэвалюцыйнай педагагічнай дзейнасці Я. Коласа складаюць ідэі народнасці, патрыятызму, глыбокай любові да Радзімы, веры ў магутныя творчыя сілы народа, барацьбы з сацыяльнай несправядлівасцю і за дэмакратызацыю школы. Вялікую ўвагу пісьменнік надаваў праблеме навучання на роднай мове. Паслядоўнік рускіх педагогаў-дэмакратаў бачыў у ідэі навучання на роднай мове пачатак барацьбы за прызнанне беларускай мовы, за ўвядзенне яе ў дарэвалюцыйных школах як вучэбнага прадмета.

Пасля рэвалюцыі 1917 года пачаліся карэнныя змены ў працэсе навучання.

У 20—30 гады XX стагоддзя асноўныя намаганні метадыстаў былі засяроджаны на распрацоўцы новых прынцыпаў навучання, на вызначэнні зместу адукацыі, на стварэнні праграм і падручнікаў. Кіруючыся агульнымі дыдактычнымі палажэннямі, у 1926 годзе Якуб Колас стварае першую методыку пачатковага навучання беларускай мове. У ёй агульныя палажэнні атрымалі сваё раскрыццё ў выглядзе канкрэтных парад і рэкамендацый.

Якуб Колас разглядаў дыдактыку як адносна самастойную навуковую дысцыпліну ў педагогіцы, якая даследуе ўмовы і спосабы найбольш дакладнага навучання. Ён вызначыў яе як тэорыю навучання. «Дыдактыка, — лічыў беларускі педагог, — выясняе асноўныя пачаткі прынцыпаў навучання, ацэньвае розныя метады і формы навучання, разглядае, з погляду стала зложаных ёю асноў, разнастайныя спосабы выкладання» [1, с. 317]. Аднак педагагічная спадчына Коласа сведчыць і аб тым, што, вызначаючы дыдактыку як тэорыю навучання, ён укладаў у гэтае паняцце больш шырокі змест, уключаючы ў яго і школьную адукацыю.

Дыдактыка, вызначаная ў «Методыцы роднай мовы», падзяляецца на дзве часткі: агульную і спецыяльную. Агульная частка дыдактыкі змяшчае ў сабе агульную тэорыю навучання. Спецыяльная частка дыдактыкі з'яўляецца методыкай, яна тлумачыць спосабы выкарыстання агульных дыдактычных прынцыпаў пры навучанні таму ці іншаму прадмету, напрыклад: пры навучанні роднай мове, гісторыі, матэматыцы і інш. Пры гэтым методыка вызначана як тэорыя выкладання таго ці іншага прадмета. Такім чынам, па меркаванні аўтара, кожны прадмет школьнага выкладання мае сваю методыку.

На думку Я. Коласа, асноўную ролю ў навучанні выконвае родная мова. Такое становішча мовы звязана з яе асаблівай роляй у жыцці грамадства. Месца роднай мовы сярод іншых прадметаў у школе вызначаецца трыма дадзенымі: агульнаасветным, выхаваўчым і практычным яе значэннем у сувязі


© Доўнар Д. С., 2018





Репозиторий БарГУ

з чытаннем і пісьмом. Пры гэтым Колас указвае на цесную сувязь мовы з мысленнем, з пазнавальнай дзейнасцю навучэнцаў. Метадыст лічыць, што навучанне роднай мове набывае асаблівы характар: «мэтаю гэтага навучання з'яўляюцца не столькі веды, колькі навыкі», а навучанне «...робіцца крыніцай новых і глыбокіх уплываў на ўвесь псіхічны склад вучняў» [1, с. 317].

З вывучэннем роднай мовы цесна звязана і знаёмства з літаратурай. У сваіх шматлікіх публіцыстычных выступленнях і артыкулах Я. Колас не аднойчы закранаў праблему выкладання літаратуры ў школе. Абавязковым, на яго думку, было вывучэнне класічнай літаратуры ўжо з пачатковых класаў. Ён лічыў неабходным уключаць у праграму не толькі вывучэнне твораў, але і жыццёвы і творчы шлях выдатных пісьменнікаў. Метадыст быў перакананы, што ў пачатковай школе «...няможна абмяжоўваць матэрыял для чытання адной дзіцячай літаратурай»; неабходна «...закідаць у дзіцячае сэрца імёны родных пісьменнікаў у сувязі з чытаннем іх твораў» [1, с. 317].

Як і К. Д. Ушынскі, Якуб Колас ставіў перад навучаннем дзве асноўныя задачы: адукацыйную і выхаваўчую. Ён разумеў працэс навучання і выхавання ў дыялектычным адзінстве, а не як тоесныя паняцці.

Ведаючы, што галоўнай задачай навучання з'яўляецца набыццё вучнямі ведаў, Я. Колас падкрэсліваў, што працэс навучання будзе прадуктыўным толькі тады, калі настаўнік і вучань актыўна і мэтанакіравана працуюць. Пад непасрэдным кіраўніцтвам настаўніка павінен праходзіць увесь працэс навучання: ад простага назірання за прадметам да фарміравання агульнага паняцця аб ім. Гэтая думка неаднаразова падкрэсліваецца на старонках «Методыкі роднай мовы». Настаўнік павінен клапаціцца пра тое, каб навучанне дасягнула пэўнай мэты пры рацыянальнай затраце часу і сіл. Добра арганізаваны працэс навучання з выкарыстаннем умела падабранага матэрыялу выклікае ў вучняў імкненне да больш глыбокага пазнання навакольнага асяроддзя, развівае іх здольнасці, робіць магчымым выкарыстоўваць веды ў практычнай дзейнасці.

Аналіз педагагічнай спадчыны Якуба Коласа паказвае, што беларускі педагог лічыў неабходнымі ўмовамі выкладання свядомасць і актыўнасць вучняў у працэсе навучання, нагляднасць навучання, сістэматычнасць, паслядоўнасць і даступнасць, сувязь тэорыі з практыкай, трываласць ведаў і навыкаў навучэнцаў, улік індывідуальных здольнасцей у навучальнай працы з дзецьмі.

У працэсе навучання фарміруецца свядомасць і актыўнасць дзяцей, таму Я. Колас звяртае ўвагу на тое, што настаўнік павінен выкарыстоўваць розныя віды вучэбнай дзейнасці, якія б спрыялі асэнсаванаму засваенню ведаў. Выкладанне павінна быць навукова даступным, але не спрошчаным. Аўтар «Методыкі роднай мовы» разглядае метады, якія садзейнічаюць успрыманню матэрыялу вучнямі не ў гатовым выглядзе, а шляхам асэнсаванай працы над імі. Колас раіў вучыць дзяцей больш назіраць за з'явамі прыроды, параўноўваць іх, знаходзіць у іх рысы падабенства і адрознення, бачыць агульнае і асноўнае, высвятляць прычыны і сувязі, узаемаадносіны і заканамернасці. Ён патрабаваў уводзіць у навучанне элементы даследавання, што з'яўляецца вельмі важным для рэалізацыі прынцыпу свядомасці, які ў сваю чаргу спрыяе разумоваму развіццю вучняў.

Асаблівую ўвагу ў набыцці трывалых ведаў Я. Колас надаваў завучванню на памяць вершаў, урыўкаў з апавяданняў і вучэбных тэкстаў. Важнасць завучвання заключаецца ў тым, што ўзбагачаецца слоўнікавы запас, папаўняюцца веды вучня. Метадыст падкрэсліваў, што розныя віды памяці патрабуюць выкарыстання адпаведных метадаў завучвання. Для таго каб прынцыпы навучання былі рэалізаваны найбольш плённа, настаўніку неабходна ведаць інтарэсы і магчымасці кожнага дзіцяці.

У 1930 годзе выйшла другое выданне дапаможніка «Методыка роднай мовы» (у сааўтарстве з В. Тэпіным), у якім асноўная ўвага надаецца вывучэнню граматыкі, навучанню правапісу, развіццю маўлення вучняў у васьмігадовай школе. У параўнанні з першым выданнем у кнізе разглядаюцца не толькі пытанні навучання грамаце (пачатковая школа), але і дэталёва аналізуецца працэс выкладання сістэматычнага курса беларускай мовы у васьмігадовай школе (фанетыка, арфаграфія, словаўтварэнне, марфалогія, сінтаксіс, пунктуацыя). Гэта выданне ў пэўнай ступені арыентавана на сістэмна-апісальны і камунікатыўна-дзейнасны падыходы ў лінгваметодыцы, а таму не страціла актуальнасці і для сучаснай школы [2, с. 16—17].

Канстанцін Міцкевіч — аўтар артыкулаў па праблемах навучання і выхавання: «Беларуская мова ў казённай школе», «Аб народным вучыцелю», «Задачы савецкай школы», «Шануйце і любіце сваю родную мову», «Нашы савецкія дзеці», «Савецкі гуманізм», «Быць грамадзянінам» і інш., у якіх выказваецца клопат пра беларускую мову, стан школы і працы настаўніка, разглядаюцца праблемы маральна-патрыятычнага выхавання моладзі.

**Заключэнне.** Вялікай заслугай Я. Коласа з'яўляецца тое, што ў перыяд станаўлення і развіцця беларускай школы ён на канкрэтных прыкладах раскрыў сутнасць дыдактычных прынцыпаў, паказваючы настаўнікам, як трэба іх прымяняць з улікам новых патрабаванняў да зместу адукацыі і навучання на роднай мове.

**Спіс цытаваных крыніц**

1. *Колас, Я.* Збор твораў : у 14 т. / Я. Колас. — Мінск : Маст. літ., 1973. — Т. 12. — С. 317.
2. *Сянкевіч, М. І.* Метадычная спадчына К. Міцкевіча (Я. Коласа) / М. І. Сянкевіч // Пачатк. шк. — 2007. — № 5. — С. 16—17.

Репозиторий БарГУ